Становление и развитие Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины: исторический экскурс

Декан исторического факультета
Н.Н.Мезга

АРХИВНАЯ ВЫПИСКА

Дадатак да пратаколу №50

Аб'яднанага пасяджэння Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР
21-га чэрвеня 1930 г. Гор.Менск

[...]

2598. Пра зацьвярджанне сеткі ўстаноў на 1930/31 г. па дзяржаўнаму бюджэту. Зацьв. Старшынёю СНК т.Галадзедам М.М. , Інд.25/1.

2598Зацвердзіць наступную сець устаноў па дзяржаўнаму бюджэту

[...]

Г. Па Наркамасьветы.

Пэдагагічныя інстытуты:

а) Віцебскі	1 з прыемам	у	300 чал.
б) Гомельскі	1 -"-		300 –"-
в) Магілеўскі	1 -"-		300 -"-

[...]

Тэхнікумы

Менскі Белпэдтэхнікум	1 з прыёмам	у	135 чал
Віцебскі -"-	1 новага прыёму няма		
Магілёўскі -"-	1 новага прыёму няма		
Гомельскі -"-	1 новага прыёму няма		

Пратакольна:

1.Абавязаць Народныя Камісарыяты – Аховы Здароўя і Асьветы з пералічанага сьпісу ўстаноў на 1930/31 г. адчыніць наступныя ўстановы ў 2-ю чаргу, г.зн. пасьля праходжаньня ў саюзных органах бюджэту БССР і ў кожным асобным выпадку з дазволу СНК.

Па Наркамасьветы

1. Інстытут педагагічны ў Магілеве

[...]

8 Тэхнікум вячэр. Аўтатрактарны у Гомелі.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і
Эканамічнай Нарады БССР М. Калевіч

Нам.Сакратара Савету Народных Камісараў БССР Я.Спэктар

Акрпрафбюро абвяшчае, што ў

ЛЯСНЫ І ПЭДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

ў Гомлі маюцца мейсцы. Заявы прымаюцца ад сяброў саюзаў да 1-га верасьня г. г.

1847



В сентябре 1930 г. директором Гомельского педагогического института был назначен **Иван Федотович Ермаков**



С декабря 1931 г. по апрель 1937 г. должность директора Гомельского педагогического института занимал

Александр Осипович Сташевский

Состав кафедр на 1933/34 учебный год

- *Кафедра ботаники – заведующий кафедрой, проф. Смирнов П.П., ассистент – Янович И.П.*
- *Кафедра биологии – заведующий кафедрой, проф. Внуковский В.В., ассистенты – Велищанский С.М., Оранский.*
- *Кафедра химии – и.о. заведующего кафедрой Ракуцько Е.Т., проф. Коротков К.Н., ассистент – Варакса П.П.*
- *Кафедра математики – и.о. заведующего кафедрой Алехнович Е.С., доцент Альтшулер И.Г., ассистенты – Агнев, Глатёнок В.Д.*
- *Кафедра физики – и.о. заведующего кафедрой Голуб И.М., проф. Матушкин И.Ф., ассистенты – Дашук, Колб Л.М., Ткачёв Е.В.*
- *Кафедра военной подготовки и физического воспитания – заведующий кафедрой Сташевский А.О., военрук Соболенко Д.А., преподаватель физкультуры Посеницкий, преподаватель методики физкультуры Шереметьев.*

Состав кафедр на 1933/34 учебный год

- *Кафедра педагогики и педологии – и.о. заведующего кафедрой Масюкова А.И., доцент педагогики Лозбень М.Ф., доцент педологии Козлов А.А., ассистенты – Василевский, Марголин И.Н., преподаватель немецкого языка Гройпинер Л.И., преподаватель практикума по белорусскому языку Варакса П.П., преподаватель практикума по польскому языку Зайцев А.А., руководитель сельхозпрактикума Моисеенко, преподаватель основ производства Рябоконь.*
- *Кафедра марксизма-ленинизма – заведующий кафедрой доцент Бердник А.Ф., преподаватель теории сельского хозяйства Сташевский А.О., преподаватель истории партии Мневец, преподаватель политэкономии Величкин А.П., ассистенты – Кветковский В.В., Калмык.*

Первый учебный корпус



Приказ НКП БССР от 2 января 1944 г. о восстановлении работы Гомельского пединститута



СЕКРЕТАРЮ ЦЕНТРАЛЬНОГО КОМИТЕТА КОММУНИСТИЧЕСКОЙ ПАРТИИ БОЛЬШЕВИКОВ БЕЛОРУССИИ.

ТОВ. М А Л И Н У В.Н.

С П Р А В К А

О ВОССТАНОВЛЕНИИ РАБОТЫ ГОМЕЛЬСКОГО ПЕДАГОГИЧЕСКОГО И УЧИТЕЛЬСКОГО ИНСТИТУТОВ.

Гомельский Педагогический Институт был организован и начал свою работу в 1930 году. За II лет своего существования Институт подготовил свыше 5-ти высоко-квалифицированных специалистов педагогов.

На трех факультетах Пединститута и 3-х отделениях Учительского Ин-та обучалось свыше тысячи студентов. Институт располагал академической библиотекой в 120 тысяч томов, музеями-зоологическим, ботаническим и геологическим, кабинетами и лабораториями.

В 1940 году Институт разместился во вновь выстроенном 4-х этажном прекрасном здании по ул. Кирова 167.

В институте были собраны и выращены необходимые профессорско-преподавательские кадры.

Нападение на нашу Родину бандитских гитлеровских полчищ временно прервало деятельность института. Часть имущества Института / 6 вагонов оборудования кабинетов, лабораторий, 15 тысяч томов библиотеки / нами была эвакуирована и сейчас сохраняется в г. Слутянске Кировской области.

Здание педагогического Института частично разрушено. Оставшееся оборудование уничтожено и разграблено.

Возобновить работу института возможно при проведении соответствующего ремонта зданий и приобретении первоочередного

ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 295

СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР

" 31 " мая 1944 года. г.Гомель.

О возобновлении работы Гомельского Педагогического и Учительского институтов".

В целях подготовки квалифицированных педагогических кадров для системы народного образования Белорусской республики, Совет Народных Комиссаров Белорусской ССР ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Возобновить с начала текущего 1944-45 учебного года работу Гомельского Педагогического и Учительского институтов.

2. Гомельский Педагогический Институт открыть в составе факультетов:

а) физико-математического	с контингентом приема	-	60	чел.
б) языка и литературы	"	" -	60	"
в) исторического	"	" -	60	"
г) естествознания	"	" -	30	"

Гомельский Учительский Институт в составе отделений:

а) физико-математического	с контингентом приема	-	90	чел.
б) языка и литературы	"	" -	90	"
в) естественно-географического	"	" -	30	"
г) исторического	"	" -	60	"

3. Обязать исполнительный комитет Гомельского областного Совета депутатов трудящихся (тов.Ковальчук) и исполком Гомельского Горсовета (тов.Кореневич):

а) передать институту не позднее 10 июля с.г. здание сталинской школы № 1 (угол Рогачевской и Песина) во временное пользование, переселив к этому времени размещенные в ней

Постановление СНК БССР от 31 мая 1944 г. «О возобновлении работы Гомельского Педагогического и Учительского институтов»

Преподаватели и сотрудники университета – участники Великой Отечественной войны

Объявление о наборе студентов

Гомельскі Дзяржаўны Педагагічны і настаўніцкі інстытут ім. В. П. ЧКАЛАВА

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ

на 1945—46 навучальны год на ўсе курсы наступных факультэтаў педінстытута

1. Мовы і літаратуры
2. Гістарычны
3. Фізіка-матэматычны
4. Прыродазнаўчы

ТЭРМІН НАВУЧАННЯ 4 ГОДЫ. Адначасова праводзіцца набор студэнтаў у Гомельскі настаўніцкі інстытут на аддзяленні:

1. Гісторыка-філалагічнае, 2. Фізіка-матэматычнае, 3. Прыродазнаўча-геаграфічнае.

ТЭРМІН НАВУЧАННЯ 2 ГОДЫ.

Заявы падаюцца на імя дырэктара педінстытута з указаннем факультэта, выбранага студэнтам, аўтабіяграфію, дакумент аб сярэдняй асвеце, даведку аб адносінах да вайсковага абавязку (для ваеннаабавязаных) і 3 фотакарткі. Пашпарт прад'яўляецца асабіста.

Прыём заяў да 31 жніўня. Прыёмныя іспыты—з 1 верасня.

Студэнты інстытута забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам і харчаваннем.

Пачатак заняткаў у інстытуце—з 17 верасня.

Адрас: г. Гомель, Педінстытут (вул. Кірава, 167).

2—2 Дырэкцыя інстытута.

Совет пединститута (1945 г.)



ПРИКАЗ № 230

ПО НАРОДНОМУ КОМИССАРИАТУ ПРОСВЕЩЕНИЯ БЕЛОРУССКОЙ ССР

"11" декабря 1945 года гор. Минск

Утвердить состав Совета Гомельского Пединститута на 1945/46 учебный год в следующем составе:

1/ ЛОЗБЕНЬ М.Ф. - Председатель Совета, директор Института;
2/ ЯНОВИЧ И.П. - Зам.директора по учебно-научной работе;
3/ КАЗАКЕВИЧ Л.В. - декан литфака;
4/ ГЛАТЕНОК В.Д. - декан физмата, зав. кафедрой;
5/ ЗЕНЬКОВИЧ А.Д. - декан а.ф-та, зав. кафедры химии;
6/ КОМИССАРИК К.А. - и.о. декана истфака;
7/ АХРЕМЧИК - зав. кафедры основ Марксизма-Ленинизма;
8/ ОРЛОВ С.М. - и.о. зав. кафедры истории;
9/ МАЕВСКИЙ С.Е. - подполковник, нач. военной кафедры;
10/ ТОМБЕРГ М.А. - зав. кафедрой иностранных языков;
11/ АЛИСИЕВИЧ И.А. - зав. кафедрой педагогики;
12/ ШМИДОВ Ф.И. - зав. кафедрой математического анализа;
13/ СИЛЬВОНИСИЙ И.И. - зав. кафедрой физики;
14/ РОТШТЕЙН Э.М. - зав. кафедрой русской литературы;
15/ БИРЮКОВА Е.С. - зав. кафедрой белорусского языка и литературы;
16/ ЗЫКОВ И.А. - зав. кафедрой географии, секретарь совета;
17/ УЛЬЯНИЦКИЙ В.А. - профессор, доктор техн.наук;
18/ РОГОВОЙ П.П. - профессор, доктор с-х наук;
19/ ПИЛАШЕВСКИЙ П.О. - профессор;
20/ РАСТВОРОВ Ф.М. - секретарь парткомитета;
21/ КАМИНСКИЙ Г.С. - пом.директора по адм.хоз.работе;
22/ ЗЛОТНИКОВА - комсорг;
23/ КРУЛИСАЧЕВ - предпрофкома;
24/ САХАМИЕС О.В. - зав. библиотекой.-

ЗАМ.НАРОДНОГО КОМИССАРА ПРОСВЕЩЕНИЯ БССР /УМРЕЙКО/

Копия верна:

секретарь

С 1954 г. по 1964 г. Гомельский государственный педагогический институт им. В.П. Чкалова возглавлял кандидат исторических наук, доцент

Степан Филиппович Ажгирей



ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Секретариата Гомельского обкома КПБ

№ СТУ/4 от "17" ноября 1955 г.

О 25-летии Гомельского педагогического института имени В.П. Чкалова

В связи с исполняющимся в ноябре месяце с.г. 25-летием со дня организации Гомельского педагогического института имени В.П. Чкалова, секретариат обкома КПБ ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Разрешить дирекции и партийному бюро института провести 5 декабря 1955 года 25-летний юбилей.

2. В качестве мероприятий провести:

а) научную сессию, посвященную 25-летию института;

б) торжественное собрание профессорско-преподавательского коллектива и студентов института.

3. Обязать Гомельский горком КПБ, дирекцию и партийное бюро института внести предложение о поощрении наиболее проявивших себя работников института.

25-летний юбилей провести под знаком дальнейшего улучшения учебно-воспитательной работы, подготовки специалистов с высшим образованием для школ области.

СЕКРЕТАРЬ ГОМЕЛЬСКОГО ОБКОМА КП БЕЛОРУССИИ (Д.ФИЛИМОНОВ)

Гомельскому пединституту – 25 лет

1966—1968 годы

- На дневном отделении студенты обучались по 7 специальностям: русский язык и литература; белорусский язык и литература; математика; физика; биология и химия; физическое воспитание; общетехнические дисциплины и физика.
- На заочном отделении подготовка велась по 6 специальностям: русский язык и литература; белорусский язык и литература; математика; биология; физическое воспитание; педагогика и методика начального образования.

С декабря 1964 г. по апрель 1969 г. Гомельский педагогический институт им. В.П. Чкалова возглавлял

Николай Миронович Ивашенко

Постановление Совета Министров СССР

12. Об организации Гомельского государственного университета.

Совет Министров Союза ССР постановляет:

Принять предложение Совета Министров Белорусской ССР и Министерства высшего и среднего специального образования СССР об организации в 1969 году Гомельского государственного университета Министерства высшего и среднего специального образования Белорусской ССР на базе Гомельского педагогического института

Зам. Председателя

Совета Министров Союза ССР К. Мазуров

Управляющий Делами

Совета Министров СССР М. Смиртюков

Москва, Кремль. 6 января 1969 г. № 5.

Центральный Комитет Коммунистической партии Белоруссии
и Совет Министров Белорусской ССР

256
21 марта 69.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

от 14 марта 1969 г. № 93
г.Минск

Об организации Гомельского государственного университета

В соответствии с постановлением Совета Министров СССР от 6 января 1969 г. № 5 Центральный Комитет КП Белоруссии и Совет Министров Белорусской ССР ПОСТАНОВЛЯЮТ:

1. Открыть с 1 мая 1969 г. в г.Гомеле на базе Гомельского государственного педагогического института имени В.П.Чкалова государственный университет Министерства высшего и среднего специального образования БССР, присвоив ему наименование "Гомельский государственный университет".

2. Иметь в составе Гомельского государственного университета следующие факультеты: историко-филологический, механико-математический, физический, биолого-почвенный, геологический, экономический и физического воспитания.

3. Отнести, в виде исключения, Гомельский государственный университет к первой категории по оплате труда работников науки.

4. Министерству высшего и среднего специального образования БССР принять меры к укомплектованию университета высококвалифицированными кадрами профессорско-преподавательского состава.

5. Академии наук БССР оказать помощь Гомельскому государственному университету по привлечению на преподавательскую работу квалифицированных специалистов из институтов и научных учреждений Академии.

6. Госстрою БССР и Министерству высшего и среднего специального образования БССР в течение 1969-1970 годов разработать генеральный план строительства Гомельского государственного университета и рабочие чертежи главного учебного корпуса и общежития.

7. Госплану БССР и Министерству высшего и среднего специального образования БССР предусмотреть в течение 1970-1975 годов необходимые капитальные вложения на строительство учебных, учебно-лабораторных корпусов и общежитий для Гомельского государственного университета.

8. Госплану БССР и Главснабу БССР совместно с Министерством высшего и среднего специального образования БССР рассмотреть вопрос о выделении для Гомельского государственного университета дополнительных фондов на оборудование, мебель и другие материалы.

Первый ректор университета

Владимир Алексеевич Белый

З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!

1870—1970

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Год выдання першы

№ 1

ПАНЯДЗЕЛАК

1

ВЕРАСНЯ

1969 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Цана 2 кап.

СЛОВА ДА ЦЯБЕ, ЧЫТАЧ!

Дарагі сябар! Ты трымаеш у руках гэты нумар газеты першы нумар сваёй газеты «Гомельскі ўніверсітэт». Перад табой, вобразна кажучы, пазнаёмленны год з'явіўся ён на свет — у год усесаюзнай ленінскай вахты. Гэта прадугледзе за газеты агаблівая патрабаванні. І галоўнае з іх — актыўна садзейнічаць далейшаму далучэнню выкладчыкаў высокакласных, цэлага загартаванага навуковага і педагагічнага кадраў. Навальі ўлёгна яна будзе гата рабіць — у многім залежыць ад цябе, паважаны чытач. Радацкім ўспрыняла, што газета звяртае сярод студэнтаў, выкладчыкаў, усіх работнікаў універсітэта самую шырокую падтрымку і дапамогу. Сваім нелагадзным удзелам, гарачай зацікаўленасцю з выпускі работы газеты ты, дарагі сябар, будзеш садзейнічаць паспяховаму нашай агульнай справе.

ДОБРАГА ШЛЯХУ!

М. БАРОДЗЯЧ,
сакратар Гомельскага ГК КПБ

Гомельскі гарадскі камітэт КП Беларусі горача і сардэчна вітае прафесарска-выкладчыцкі состаў, студэнтаў, работнікаў універсітэта з пачаткам навучальнага года!

Зусім нядаўна грамадскасць нашага горада не толькі абстаўпіла адкрыццё Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Адкрыццё універсітэта вялікая падзея ў жыцці нашага горада. У нас з'явілася магчымасць у падрыхтоўцы навуковых кадраў, работнікаў розных галін народнай гаспадаркі, з выкліканым і культурным развіццём горада. Адкрыццё ўніверсітэта — вынік клопатаў, нашых працаўнікоў. Колькі нервовых хвіляў, сакрэцкіх бяссонных ночаў аб развіцці навукі і культуры ў краіне аб'ядналі, і культурным развіццём Беларусі.

Да гэтага Савецкай улады горад Гомель стаў не толькі буйным індустрыяльным цэнтрам Беларусі, але і буйным навуковым цэнтрам. Цяпер у гэ. есць дзе: вышэйшыя навучальныя. Установы. У нас працуе вялікая група навуковых супрацоўнікаў, з іх сярод 17 дактароў, прафесараў і больш 100 кандыдатаў навук, дадзены. У мінулым навучальным годзе ў горадзе адкрыты два філіялы: культатаматычны факультэт Мінскага політэхнічнага інстытута і пры заводзе «Гомсельмаш» філіял Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута.

З новым годам расце і горадзе і гэтак навуковых устаноў. Перыяд з іх — Беларускі навукова-даследны інстытут лясной гаспадаркі быў арганізаваны ў 1930 годзе на базе дзяржаўнай даследчай станцыі і лясного аддзела навукова-даследчага інстытута сельскай гаспадаркі БССР.

У 1960 годзе рашэннем Прэзідыума Акадэміі навук БССР у горадзе была створана лабараторыя механікі палімераў. Актуальнасць гэтай навуковай лабараторыі навуковых даследаванняў пацвердзіла ў іх многіх навуковых напрамкаў і пры мясцовых прадпрыемствах спрыяла іх хуткаму росту, і ўжо праз тры гады лабараторыя была ператворана ў самастойны аддзел механікі палімераў. Гэтым годам аддзел ператворан у навукова-даследны інстытут механікі металапалімерных сістэм АН БССР.

Далёка за межамі рэспублікі ведамы Беларускі інстытут вяльнёнай чыгуначнага транспарту. Ён пераўзышла кароткі тэрмін свайго існавання інстытут аднаўляе пасцярнікам. Калі 20 тысяч студэнтаў, навучаецца сярэдніх спецыяльных і прафесіянальных навучальных устаноў горада запобіглі сёння здзіўлены. Пачаўся новы навучальны год. Ён адзначаны навучальных устаноў сумесна з усімі прыгожымі горадамі выступаюць дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна. У Ладзімір Ільіч прывёў нашу моладзь вучыцца этыцыцца каварыяст. Ён падкрэсліў, што свабодным камуністам можна стаць толькі тады калі ўвабраеш сваёмі ведамі, усім тым дужэйшым багаццем, яна прадпрымала чалавецтва. Сакрэты навучальных устаноў пастаўць не толькі высококваліфікаваных спецыялістаў?

З іх стрэх павінны выходзіць палітычна - адукаваныя, здольна пераносныя будаўнічы камунізму, патрыёты. Вежы вялікарыя чымчыкі для палепшання цэлага выкладчыцкай работы са студэнтамі і навучэнцамі адукаванасці. У гэлях з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння вялікага правадыра.

Прафесарска-выкладчыцкі калектыў, партыйныя і камсамольскія арганізацыі навучальных устаноў горада павінны ўзначаліць дасягнанне студэнтаў у дзіцяе вершаці сустрэчы заняткам, гатоўнасці і ўмення настойліва авалодаць ведамі, навыкамі і спецыяльнасцямі.

ДОБРАГА ВАМ ПАЧАТКУ, ДОБРАГА ШЛЯХУ!

На здымках: стары і новы корпусы ўніверсітэта.

ДЗЕНЬ ДОБРЫ, УНІВЕРСІТЭТ!

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

На трыбуне — сакратар Чыгуначнага райкома КПБ т. Сафронава Т. В. Яна звяртаецца да сабраўшыхся з цёплым словам прывітання, заклікае студэнтаў аддаваць вучобе ўсе свае сілы і з гонарам сустрэць слаўны юбілей Ільіча.

У гэты час да ўніверсітэта набліжаецца ўрачыстая эстафета. Яе ўдзельнікі — лепшыя спартсмены ўніверсітэта — нясуць факел, запалены ад вечнага агню на магіле паўшых герояў. На апошнім этапе эстафеты факел нясе неаднаразовы чэмпіён Беларусі, рэкардсмен універсітэта па лёгкай атлетыцы, сёлетні выпускнік нашага вуза Віктар Губанаў. Спартсмен з факелам падыходзіць да сімвалічнай чашы ведаў і запальвае ў ёй агонь. Ва ўрачыстай цішыні гучаць словы клятвы студэнтаў-першакурснікаў, якую зачытвае студэнт біёлага-глебавага факультэта Мікалай Белаўс.

Затым рэктар універсітэта Ул. А. Белы ўручае першакурсніцы гісторыка-філалагічнага факультэта Таццяне Барадзіной сімвалічны студэнцкі білет.

Ленінскі стыпендыят, студэнтка 4-га курса біёлага-глебавага факультэта Тамара Ільянкова перадае першакурсніцы фізічнага факультэта Валянціне Пешкавай сімвалічны ключ ад Палаца навукі — самага маладога ў нашай краіне ўніверсітэта — Гомельскага дзяржаўнага.

— Запрашаем вас, — гаворыць Тамара Ільянкова. — Дарагія першакурснікі, ва ўніверсітэт! Сёння для вас прагучыць першы студэнцкі званок. Шчаслівага шляху ў навуку!

(Наш кар.).

НА ЗДЫМКАХ: злева — клятву першакурснікаў зачытвае студэнт біёлага-глебавага факультэта Мікалай Белаус. Справа — уручэнне сімвалічнага ключа ад універсітэта.

КЛЯТВА ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Мы, студэнты першага курса Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, у гэты святочны дзень пачатку новага перыяду нашага жыцця, уліваючыся ў рады слаўнага савецкага студэнцтва, урачыста клянёмся:

Быць да канца вернымі справе вялікага Леніна, камуністычнай партыі і савецкага народа, свята захоўваць і памнажаць вялікія заваёвы сацыялізма;

КЛЯНЕМСЯ!

З усёй страсцю маладых сэрцаў упарта і настойліва авалодваць тайнамі навук, памнажаць сілу розуму чалавека;

КЛЯНЕМСЯ!

З пачуццём вялікай адказнасці несці святло ведаў у гушчу народных мас, выхоўваць савецкую моладзь у духе беззапаветнай адданасці высокароднымі ідэялам камунізма;

КЛЯНЕМСЯ!

Клапатліва захоўваць і памнажаць лепшыя традыцыі студэнцкай моладзі: дружбу, дапытлівасць, высокую грамадскую актыўнасць, вернасць камсамольскаму слову;

КЛЯНЕМСЯ!

Быць да канца адданымі сваёй навуковай спецыяльнасці і зрабіць усё магчымае для яе развіцця і ўдасканалення;

КЛЯНЕМСЯ!

Быць дастойнымі і актыўнымі ўдзельнікамі станаўлення новага свету — будаўніцтва камунізма;

КЛЯНЕМСЯ!

Захоўваць у нашых сэрцах светлае пачуццё любві да нашага ўніверсітэта, садзейнічаць яго працвітанню і славе;

КЛЯНЕМСЯ!

Мы будзем заўсёды захоўваць вернасць гэтай нашай урачыстай клятве!

КЛЯНЕМСЯ! КЛЯНЕМСЯ! КЛЯНЕМСЯ!

Приказ №443

2 декабря 1969 г.

Утвердить Совет ГГУ на 1969/1970 учебный год:

*1. **Белый В.А.** – ректор университета, член-корр. АН БССР.*

*2. **Харитонович Ф.В**. – и.о. проректора по учебной работе,.*

*3. **Сафонов С.А**. – проректор по научной работе,.*

*4. **Лашкевич А.И.** – проректор по заочному обучению.*

*5. **Леонченко Д.А.** – и.о. декана историко-филологического факультета, кандидат филологических наук, доцент.*

*6. **Харитонов В.В.** – и.о. декана физического факультета, кандидат физико-математических наук.*

*7. **Елецкий Н.А.** – и.о. декана механико-математического факультета, и.о. старшего преподавателя.*

*8. **Семикоп А.Ф**. – и.о. декана факультета физвоспитания, и.о. старшего преподавателя.*

*9. **Бенедиктов А.А**. – и.о. зав. кафедрой всеобщей истории.*

*10. **Брит В.Е.** – и.о. зав. кафедрой политэкономи.*

*11. **Жарков И.В.** – и.о. зав. кафедрой зоологии и дарвинизма.*

*12. **Кинзикеев А.Р.** – и.о. зав. кафедрой геологии.*

*13. **Мелёхин Г.П.** – и.о. зав. кафедрой физиологии спорта и спортивной медицины.*

*14. **Охрименко П.П.** – и.о. зав. кафедрой литературы.*

*15. **Паламарчук А.С.** – и.о. зав. кафедрой биологии.*

*16. **Полетаев П.В.** – и.о. зав. кафедрой физиологии человека и животных.*

*17. **Семенчук Е.А.** – и.о. зав. кафедрой истории КПСС и научного коммунизма.*

*18. **Сидоров В.С**. – и.о. зав. кафедрой философии.*

*19. **Янкова Т.С**. – и.о. зав. кафедрой русского и белорусского языков.*

*20. **Шевченко В.А.** – проректор по административно-хозяйственой работе.*

*21. **Алешко С.Ф.** – и.о. ст. преподавателя кафедры зоологии и дарвинизма, кандидат биологических наук.*

*22. **Драцевич М.Л**. – зав. библиотекой.*

*23. **Ермолаев Я.Р.** – секретарь парткома.*

*24. **Эсмантович И.Ф.** – секретарь комитета ЛКСМБ.*

*25. **Паламарчук А.С.** – председатель профкома.*

Министр *Н.М. Мешков*

Количественный состав кафедр
Гомельского государственного университета

№ п/п	Кафедра	Ф.И.О. заведующего	Доктора наук	Кандидаты наук	Без степени
1.	Истории КПСС и научного коммунизма	канд. ист. наук, доц. Семенчук Е.А.	2	10	5
2.	Философии	канд. философ. наук, доц. Сидоров В.С.	-	6	3
3.	Политэкономии	канд. ист. наук, доц. Брит В.Е.	-	5	2
4.	Педагогики и психологии	канд. пед. наук, доц. Балашов Е.И.	-	4	7
5.	Русского и белорусского языков	канд. фил. наук, доц. Янкова Т.С.	-	6	9
6.	Русской и белорусской литературы	доктор. фил. наук, проф. Охрименко П.П.	1	7	5
7.	Иностранных языков	ст. преп. Акулов И.М.	-	-	20
8.	Математического анализа	канд. физ.-мат. наук, доц. Шмидов Ф.И.	-	4	13
9.	Алгебры и геометрии	канд. физ.-мат. наук, доц. Шеметков Л.А.	1	4	3
10.	Физики твёрдого тела	доктор тех. наук, проф. Гаркунов Д.Н.	1	4	5
11.	Теоретической физики	канд. физ.-мат. наук, доц. Симонов В.Г.	-	3	7
12.	Общей физики	канд. физ.-мат. наук, доц. Лягин И.В.	-	2	8
13.	Химии	канд. химических наук, доц. Малахова А.Я	-	5	5
14.	Физиологии растений	доктор сельхоз. наук, проф. Харитонович Ф. Н.	1	2	4
15.	Ботаники	доктор биолог. наук, проф. Паламарчук А.С.	1	5	3
16.	Зоологии и дарвинизма	доктор биолог. наук, проф. Жарков И.В.	1	3	1
17.	Физиологии человека и животных	доктор биолог. наук, проф. Полетаев П.В.	1	5	3
18.	Общей геологии	доктор геолого-минерал. наук, проф. Кинзикеев А.Р.	1	-	3
19.	Физиологии, спорта и спортивной медицины	доктор биолог. наук, проф. Мелёхин Г.П.	1	2	5
20.	Теории и практики физвоспитания	канд. пед. наук, и.о. доц. Борисов Г.К.	-	1	25
21.	Лёгкой атлетики	и.о. доц. Толстопятов Н.П.	-	-	15
22.	Спортивных игр	и.о. доц. Селиванов В.И.	-	-	15
23.	Лыжного спорта	канд. биолог. наук, и.о. доц. Волков И.П.	-	1	13
	Всего:		11	79	179

На 1 красавіка 1970 г.

Корпус № 4, 1973 г.

Первый класс ЭВМ в корпусе № 4

Ректор университета с 1973 – 1989 гг.

Борис Васильевич Бокуть

Заседание ректората

Пасяджэнне Савета па НДРС

ПАЛАЖЭННЕ АБ ПАДВЯДЗЕННІ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА КАФЕДР НА ЗВАННЕ «ЛЕПШАЯ КАФЕДРА ЎНІВЕРСІТЭТА»

Спаборніцтва паміж кафедрамі факультэта арганізуецца з мэтай далейшага ўдасканальвання вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і грамадска-палітычнай работы на кафедрах, павышэння якасці падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання спецыялістаў.

Вынікі спаборніцтва падводзяцца штогод і абмяркоўваюцца на ўрачыстым пасяджэнні супрацоўнікаў універсітэта.

Ацэнка дзейнасці кафедры праводзіцца па чатырох асноўных раздзелах, якія маюць адпаведна вагу 15, 35, 35 і 15 прац.

I. Падрыхтоўка кадраў.
II. Навукова-даследчая работа.
III. Вучэбна-метадычная работа.
IV. Грамадска-палітычная работа.

Колькасць балаў па I, II, III раздзелах вызначаецца па суме здабыткаў вагавых каэфіцыентаў на працэнт. Пераможцамі па гэтых раздзелах з'яўляюцца кафедры, якія маюць большую колькасць балаў. Месца па раздзелу IV вызначаецца грамадскімі арганізацыямі з улікам выхаваўчай, культурна-масавай і спартыўна-масавай работы выкладчыкаў.

У залежнасці ад колькасці кафедр, якія ўдзельнічаюць у спаборніцтве, і занятых імі месц, кожнай кафедры па ўсіх раздзелах налічваецца пэўная колькасць балаў. Так, напрыклад, калі ў спаборніцтве ўдзельнічаюць 6 кафедр, то кафедры, якая зойме 1-е месца, налічваецца 6 балаў, а кафедры, якая зойме апошняе месца — 1 бал.

У адпаведнасці з гэтым агульная колькасць ачкоў, якая налічваецца за кожны раздзел, вызначаецца як здабытак балаў, якімі ацэнена месца, на вагавы працэнт раздзела.

На факультэтах падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва на лепшыя факультэцкія кафедры, якія затым прымаюць удзел у спаборніцтве паміж сабой па сваіх групах на званне лепшай універсітэцкай кафедры.

Для найбольш аб'ектыўнай параўнальнасці вынікаў работы кафедры размяркоўваюцца па групах наступным чынам.

1. Кафедры прыродазнаўчых факультэтаў (фізічнага, матэматычнага, біялагічнага, эканамічнага і геалагічнага) і кафедра фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны.

2. Кафедры гісторыка-філалагічнага факультэта, англійскай мовы, французскай і нямецкай моў.

3. Агульнаўніверсітэцкія кафедры — гісторыі КПСС, філасофіі, палітэканоміі, навуковага камунізму, педагогікі і псіхалогіі.

4. Спартыўныя кафедры і кафедра грамадзянскай абароны.

Для кафедр першай групы ўстанаўліваюцца тры, а для астатніх груп — па два прызавыя месцы.

Пры роўных сумах ачкоў па ўсіх раздзелах пераможцай аб'яўляецца кафедра, якая зойме лепшае месца па раздзелу «Вучэбна-метадычная работа».

Кафедры, заняўшыя першае месца, узнагароджваюцца пераходным вымпелам і Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома, а кафедры, якія займуць другое і трэцяе месцы — Ганаровай граматай рэктарата, парткома і мясцкома.

Для падвядзення вынікаў спаборніцтва распараджэннем па факультэту стварэцца камісія з прадстаўнікоў дэканата і грамадскіх арганізацый.

РАЗДЗЕЛ I. ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ

1. Працэнт супрацоўнікаў кафедры, якія абаранілі доктарскія дысертацыі, у адносінах да колькасці супрацоўнікаў, якія маюць ступень кандыдата навук — вагавы каэф. 10.

2. Працэнт выкладчыкаў кафедры, якія абаранілі за справаздачны перыяд кандыдацкія дысертацыі, у адносінах да ліку выкладчыкаў, якія не маюць вучонай ступені — каэф. 5.

3. Працэнт аспірантаў кафедры, якія закончылі аспірантуру ў тэрмін (абаранілі ці здаўшых дысертацыю ў Вучоны савет) — каэф. 2.

4. Працэнт выкладчыкаў кафедры, здаўшых экзамены кандыдацкага мінімума, у адносінах да ліку выкладчыкаў без вучоных ступеняў — каэф. 0,3. Калі ва ўсіх выкладчыкаў здадзены экзамены кандыдацкага мінімума, то кафедры па § 4 налічваецца 100 працэнтаў.

5. Працэнт выкладчыкаў кафедры, якія прайшлі курсы павышэння кваліфікацыі праз ФПК, ІПК або стажыроўкі — каэф. 0,2.

6. Працэнт выкарыстаных у бягучым годзе штатных адзінак навуковых супрацоўнікаў для завяршэння доктарскіх дысертацый у адносінах да ліку супрацоўнікаў, якія маюць ступень кандыдата навук — каэф. 2.

II. НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА

1. Працэнт выкладчыкаў, якія ўдзельнічаюць у выкананні гаспдагаворнай тэматыкі — каэф. 0,2.

2. Эканамічная эфектыўнасць навуковых даследаванняў згодна актаў укаранення на 1 руб. затрат — каэф. 10.

3. Адносіны ў працэнтах колькасці ўкаранёных тэм (па актах укаранення) да агульнай колькасці тэм кафедры, закончаных у папярэднім і бягучым годзе — каэф. 1,0.

4. Адносіны ў працэнтах колькасці апублікаваных за год манаграфій і навуковых зборнікаў да колькасці выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі:

а) аб'ёмам ад 5 да 10 друкаваных аркушаў — каэф. 4.
б) аб'ёмам ад 10 да 15 друкаваных аркушаў — каэф. 6.
в) аб'ёмам звыш 15 друкаваных аркушаў — каэф. 8.

5. Адносіны ў працэнтах колькасці навуковых артыкулаў, апублікаваных ва ўсесаюзных выданнях, да агульнай колькасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры — каэф. 0,8.

6. Адносіны ў працэнтах колькасці навуковых артыкулаў, апублікаваных у рэспубліканскіх выданнях, да агульнай колькасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры — каэф. 0,5.

7. Адносіны ў працэнтах колькасці навуковых дакладаў, прачытаных на канферэнцыях, з'ездах, сімпозіумах, да агульнай колькасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры:

а) міжнародных — каэф. 5;
б) усесаюзных — каэф. 0,5;
в) рэспубліканскіх — каэф. 0,3;
г) абласных — каэф. 0,2;
д) унутрывузаўскіх — каэф. 0,1.

8. Колькасць навуковых канферэнцый, арганізаваных і праведзеных кафедрай:

а) усесаюзных — каэф. 20;
б) рэспубліканскіх — каэф. 10;
в) міжвузаўскіх і абласных — каэф. 5.

9. Адносіны ў працэнтах колькасці станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў да агульнай колькасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры — каэф. 10.

10. Адносіны ў працэнтах колькасці студэнцкіх навуковых работ на рэспубліканскім агляде-конкурсе па прыродазнаўчых і гуманітарных навуках да агульнай колькасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры ўдастоеных:

а) першай катэгорыі — каэф. 1,0;
б) другой катэгорыі — каэф. 0,7;
в) трэцяй катэгорыі — каэф. 0,3;
г) адхілены — каэф. —1.

11. Адносіны ў працэнтах колькасці студэнцкіх навуковых работ, адзначаных медалямі і дыпломамі на ўсесаюзным конкурсе па прыродазнаўчых і гуманітарных навуках, да агульнай колькасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры:

а) медалямі — каэф. 3;
б) дыпломамі — каэф. 2.

12. Адносіны ў працэнтах колькасці навуковых артыкулаў, апублікаваных студэнтамі, у тым ліку і ў саўтарстве з выкладчыкамі, да агульнай колькасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры:

а) у саюзным друку — каэф 1,0;
б) у рэспубліканскім друку — каэф. 0,6.

13. Прапановы кафедры аб уліку дадатковай навукова-даследчай работы.

РАЗДЗЕЛ III. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ РАБОТА

1. Адносіны ў працэнтах колькасці апублікаваных за год у агульнасаюзных і рэспубліканскіх выдавецтвах падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў да ліку выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі:

а) аб'ёмам да 5 друкаваных аркушаў — каэф. 4;
б) аб'ёмам ад 5 да 10 друкаваных аркушаў — каэф. 6;
в) аб'ёмам больш 10 друкаваных аркушаў — каэф. 8.

2. Адносіны ў працэнтах колькасці апублікаваных за год ва ўнутрывузаўскім выданні вучэбна-метадычных дапаможнікаў да агульнай колькасці выкладчыкаў:

а) аб'ёмам да 2 друкаваных аркушаў — каэф. 1,5;
б) аб'ёмам ад 2 да 4 друкаваных аркушаў — каэф. 2,0;
в) аб'ёмам больш 4 друкаваных аркушаў — каэф. 2,5.

3. Колькасць вучэбна-метадычных канферэнцый, арганізаваных і праведзеных кафедрай — каэф. 15.

4. Колькасць пастаянна дзеючых на кафедры навукова-метадычных семінараў — каэф. 10.

5. Адносіны ў працэнтах колькасці дакладаў на вучэбна-метадычных канферэнцыях да агульнай колькасці членаў кафедры — каэф. 1,0.

6. Адносіны ў працэнтах колькасці апублікаваных артыкулаў па методыцы выкладання і выхаваўчай рабоце да агульнай колькасці членаў кафедры — каэф. 1,5.

7. Працэнт дыпломных работ, рэкамендаваных ДЭК да ўкаранення і апублікавання — каэф. 1,0.

8. Прапановы кафедры аб уліку дадатковай вучэбна-метадычнай работы.

Вытворчая камісія мясцкома просіць загадчыкаў кафедр і старшынь прафсаюзных бюро ўсе заўвагі, што датычаць прыведзенай методыкі падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва, накіроўваць мясцоваму камітэту ГДУ. Такія заўвагі будуць садзейнічаць далейшаму ўдасканальванню «Палажэння» і ўлічаны пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва ў бягучым годзе.

60-годдзю ВЛКСМ — дастойную сустрэчу!

ПАЛАЖЭННЕ

Аб агляде-конкурсе на лепшую акадэмічную групу ўніверсітэта

XVII з'езд ВЛКСМ і XXV з'езд ЛКСМБ вызначылі задачы па ўдасканаленню дзейнасці камсамольскіх арганізацый вышэйшых навучальных устаноў у святле пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР па вышэйшай школе, пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце ў Маскоўскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы імя М. Э. Баумана» і Саратаўскім дзяржуніверсітэце імя М. Г. Чарнышэўскага па павышэнню ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладання грамадскіх навук».

Выконваючы наказ партыі, камсамольцы ГДУ павінны накіроўваць усе свае намаганні на аказанне ўсебаковай дапамогі партыйным арганізацыям, прафесарска-выкладчыцкаму калектыву ў падрыхтоўцы і камуністычным выхаванні будучых спецыялістаў, якія б добра валодалі асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, бачылі палітычныя мэты і задачы партыі, мелі шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодалі сваёй спецыяльнасцю.

Рашэнне гэтых задач у многім вызначаецца якасцю работы кожнага камсамольца, кожнай акадэмічнай групы.

Усе студэнцкія калектывы павінны своечасова і якасна выконваць вучэбны план, актыўна ўдзельнічаць у навукова-даследчай і грамадска-палітычнай рабоце. У групах павінна быць абстаноўка ўзаемадапамогі, патрабавальнасці і творчай актыўнасці, абстаноўка, якая садзейнічае выхаванню савецкіх спецыялістаў — людзей высокай культуры і шырокай эрудыцыі.

З гэтай мэтай на аснове пастаноў ЦК ЛКСМБ, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Гомельскага АК ЛКСМБ камітэт камсамола ГДУ сумесна з прафкомам праводзіць агляд-конкурс на лепшую акадэмічную групу ўніверсітэта, які прысвячаецца 60-годдзю ВЛКСМ.

УМОВЫ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

Лепшая акадэмічная група ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце вызначаецца па наступных паказчыках:

— выкананне групавых сацыялістычных абавязацельстваў;

— выкананне асабістых комплексных планаў;

— прахаджэнне грамадска-палітычнай практыкі;

— падрыхтоўка і правядзенне вучэбных заняткаў;

— вынікі сесіі.

I. ВУЧЭБНАЯ РАБОТА

1. Абсалютная паспяховасць (у працэнтах).

2. Сярэдні бал у групе.

3. За кожнага студэнта групы, здаўшага сесію на «добра» і «выдатна» +20.

4. За кожнага выдатніка ў групе +30.

5. За кожнага персанальнага стыпендыята групы +50.

6. За кожную гадзіну пропускаў заняткаў без уважлівых прычын на аднаго чалавека —1.

7. За кожнага студэнта, які мае акадэмічную запазычанасць пасля сесіі —40.

II. НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА

1. За кожнага студэнта групы, які актыўна ўдзельнічае ў НДРС +5.

2. За навуковы і навукова-папулярны даклад (указаць прозвішча студэнта):

а) які прадстаўлен на конкурс студэнцкіх навуковых работ ГДУ +10;

б) заахвочаны ў даным конкурсе:

1-е месца +25

2-е месца +20

3-е месца +15

У нагароджанні у даным конкурсе дыпломам +25

заахвочан падзякай рэктара +20

падзякай дэканата +15

граматай камітэта камсамола, прафкома +15;

в) за прачытаны рэферат у групе +5;

г) за прачытаны рэферат на канферэнцыі НДРС па-за ГДУ +30.

3. За ўдзел у іншых конкурсах навуковага характару, выстаўках, алімпіядах і інш. +10.

4. За кожнага студэнта, які ўдзельнічае ў гаспдагаворнай рабоце і распрацоўцы дзяржбюджатных тэм +20.

5. За публікацыі і артыкулы ў друку (указаць аўтара і назву артыкула):

а) за публікацыі і артыкулы ў навуковых часопісах, міжвузаўскіх зборніках +40.

б) за артыкулы ў перыядычным друку (таксама ў газеце «Гомельскі ўніверсітэт) +5;

в) за артыкулы ў факультэцкім насценным друку +3.

III. ГРАМАДСКАЯ РАБОТА, СПОРТ, УДЗЕЛ У СБА

1. Калектыўныя мерапрыемствы, якія праводзяцца ў групе (не менш 70 працэнтаў студэнтаў):

а) за мерапрыемствы, якія праводзяцца па-за ГДУ (школы, дзіцячыя паркі міліцыі, прапагандысцкая работа) +20;

б) арганізацыя вусных часопісаў, «Агеньчыкаў», экскурсій і іншых мерапрыемстваў +15;

в) наведванне музеяў, тэатраў і г. д. +10.

2. За выкананне грамадскіх мерапрыемстваў:

а) за выкананне грамадскіх абавязакаў у маштабе ГДУ (па даручэнню камітэта камсамола, прафбюро) +20;

б) у маштабе курса +5.

3. За кожнага студэнта, які ўдзельнічае ў СБА +15.

4. За кожнага студэнта, які ўдзельнічае ў ДНД +10.

5. За ўдзел у калектывах мастацкай самадзейнасці:

а) у маштабе ГДУ +10;

б) у маштабе факультэта +5.

6. За ўдзел у спартыўных мерапрыемствах:

а) за кожнага студэнта, выканаўшага нормы ГПА +20;

б) за кожнае 1, 2, 3 месца на факультэцкіх спартыўных спаборніцтвах +8, 6, 4;

в) за кожнае 1, 2, 3 месца ў спартыўных спаборніцтвах ГДУ +15, 10, 8;

г) за ўдзел групы ў масавых спаборніцтвах, кросах, днях здароўя —40.

7. За кожнага студэнта групы, атрымаўшага падзяку рэктара +30, дэкана +10.

8. За парушэнне норм паводзін па ўніверсітэце, інтэрнаце і іншым месцы —50.

Агляд-конкурс на лепшую акадэмічную групу праводзіцца ў два этапы. Першы этап агляду-конкурсу прысвячаецца XVIII з'езду ВЛКСМ. Пераможца першага этапа вызначецца па выніках работы першага семестра па стану на пачатак другога семестра.

Другі этап прысвячаецца 60-годдзю Ленінскага камсамола.

Пераможца другога этапа вызначецца па выніках работы другога семестра па стану на пачатак новага навучальнага года і ўдзелу ў СБА. Вынікі прадставіць камітэту камсамола ГДУ:

I этап — да 20 лютага 1978 года.

II этап — да 1 кастрычніка 1978 года.

Пераможцамі агляду-конкурсу лічацца акадэмічныя групы, якія маюць найбольш высокія вынікі па ўсіх паказчыках.

Пераможца спаборніцтва ўзнагароджваюцца: пераходнымі вымпеламі, граматамі камітэта камсамола, прафкома выдатковае сродкі для заахвочвання па I этапу:

за I-е месца — пераходны вымпел, грамата рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафкома, каштоўны падарунак.

За II-е месца — грамата рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафкома, каштоўны падарунак.

За III-е месца — каштоўны падарунак.

Па II этапу:

За I-е месца — 200 рублёў

за II-е месца — 150 рублёў

за III-е месца — 100 рублёў

(з фонда рэктара).

Размеркаванне студэнтаў ГДУ (1978 г.)

Совет Министров Белорусской ССР

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

от 29 ноября 1988 г. № 349

г. Минск

02 32-247/12 88 г.

О ПРИСВОЕНИИ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ ГОМЕЛЬСКОМУ ГОСУДАРСТВЕННОМУ УНИВЕРСИТЕТУ

Совет Министров Белорусской ССР постановляет:

Присвоить имя Франциска Скорины Гомельскому государственному университету Министерства народного образования БССР и впредь именовать его: Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины.

Зам. Председателя Совета Министров Белорусской ССР — В. Евтух

Управляющий Делами Совета Министров Белорусской ССР — Н. Максимов

УПРАВЛЕНИЕ ДЕЛАМИ СОВЕТА МИНИСТРОВ БССР

12

Председатель Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь А. А. Малофеев вручает ректору университета Л.А.Шеметкову Почетное государственное знамя, 1999 г.

Рэктар універсітэта ў 1989 – 2000 гг.
Леанід Аляксандравіч Шамяткоў

Рэктар універсітэта ў 2000 – 2003 гг.
Міхаіл Васільевіч Селькін

Савет па абароне доктарскіх дысертацый па спецыяльнасці «Матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў»

Адкрыццё Франка-Беларускага інстытута кіравання (1995 г)

Рэктар універсітэта з 2004 г.
Аляксандр Уладзіміравіч Рагачоў

12 ИЮНЯ 2009

Візіт у ГДУ імя Ф. Скарыны міністра адукацыі А. М. Радзькова (2005 г.)

Намеснік старшыні Савета міністраў Беларусі А. А. Тозік у ГДУ, снежань 2011 г.

Чэрвень 2011 г. Візіт у ГДУ імя Ф.Скарыны групы рэктараў і прарэктараў з КНР

Дэлегацыя ГДУ імя Ф. Скарыны на 1-м З’ездзе вучоных Беларусі

У 2010 г. універсітэт атрымаў сертыфікат па сістэме менеджменту якасці адукацыі